Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

6 СНЕЖНЯ 2014 г. СУБОТА № 232 (27842) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Зніжаем выкіды парніковых газаў

СТАР. 2



Палехскія іконы для мінскага храма

СТАР. 4



Бацькі называлі яго Айбаліт

СТАР. 4

## ДЗЕЦІ ПАВІННЫ БЫЦЬ ЖАДАНЫМІ

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ўхваліў рашэнне аб увядзенні з 1 студзеня 2015 года сямейнага капіталу ў памеры $10 тысяч пры нараджэнні трэцяга або наступных дзяцей**

**Аб гэтым кіраўнік дзяржавы заявіў на сустрэчы з міністрам працы і сацыяльнай абароны насельніцтва Марыянай Шчоткінай, паведамляе БЕЛТА.**

«Мы вызначыліся, што для нас гэта найважнейшая праблема. Насельніцтва ў Беларусі павінна прырастаць», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Прэзідэнту быў прадстаўлены праект указа па дзяржпадтрымцы сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей, і стымуляванні нараджальнасці, распрацаваны з улікам заўваг і прапаноў, што абмяркоўваліся на адпаведнай нарадзе ў кіраўніка дзяржавы. Праектам указа адносна сямейнага капіталу прадугледжваецца аднаразовае прадастаўленне сем'ям безнаяўных грашовых сродкаў у памеры $10 тысяч пры нараджэнні трэцяга або наступных дзяцей. Права на сямейны капітал маюць грамадзяне Беларусі пры нараджэнні або ўсынаўленні трэцяга і наступных дзяцей, якія нарадзіліся з 1 студзеня 2015 года да 31 снежня 2019 года. Прызначэнне сямейнага капіталу будзе ажыццяўляцца пры звароце ў мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы. Права на зварот па прызначэнне сямейнага капіталу можа быць рэалізавана на працягу 6 месяцаў з дня нараджэння або ўсынаўлення трэцяга і наступных дзяцей. Права распараджэння сродкамі сямейнага капіталу настане праз 18 гадоў з даты нараджэння гэтага дзіцяці. Сродкі сямейнага капіталу сям'я зможа накіроўваць на паляпшэнне жыллёвых умоў, атрыманне адукацыі, паслуг у сферы сацыяльнага абслугоўвання, аховы здароўя, фарміраванне накапляльнай пенсіі маці. Пры гэтым сродкі могуць быць выкарыстаны датэрмінова на атрыманне платных медыцынскіх паслуг. Сродкі сямейнага капіталу будуць размяшчацца на дэпазітарных рахунках грамадзян у ААТ «ААБ Беларусбанк».

Акрамя таго, праектам указа запланавана, што сем'ям, якія выхоўваюць двое або больш непаўналетніх дзяцей, будзе прадастаўляцца штомесячная дапамога ў памеры 50 працэнтаў найбольшай велічыні бюджэту пражытковага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва, зацверджанага Мінпрацы і сацабароны, за два апошнія кварталы. Права на дапамогу будуць мець маці ці бацька (усынавіцель, апякун), якія выхоўваюць адначасова дзяцей ва ўзросце да трох гадоў і ад трох да 18 і маюць права на дапамогу па доглядзе дзіцяці да трох гадоў.

Пры прызначэнні дапамогі не будуць улічвацца дзеці, якія знаходзяцца ў дзіцячай інтэрнатнай установе, а таксама ўстанове адукацыі з кругласутачным рэжымам знаходжання. Акрамя таго, не будуць мець права на гэты від дзяржпадтрымкі бацькі, пазбаўленыя бацькоўскіх правоў, чые дзеці знаходзяцца на дзяржзабеспячэнні.

Маладым сем'ям з дваімі непаўналетнімі дзецьмі будзе зніжана да 5 працэнтаў стаўка за карыстанне льготным крэдытам на будаўніцтва жылля, запланавана праектам указа.

Марыяна Шчоткіна звярнула ўвагу на добрую тэндэнцыю: у 2013 годзе нарадзілася 56 тыс. дзяцей, якія з'яўляюцца першымі ў сям'і, і 62 тыс., якія з'яўляюцца другімі і наступнымі. «Хацелася б, каб сем'і раслі, — сказала Марыяна Шчоткіна, — кожная сям'я жадала б мець як мінімум дваіх дзяцей. Але, вядома, ставяцца пытанні аб набыцці жылля і падтрымцы з боку дзяржавы».

Як адзначыла Марыяна Шчоткіна, у Беларусі робіцца максімум для таго, каб падтрымаць сем'і з дзецьмі. «Заўсёды трэба памятаць аб тым, што нічога не бывае бясплатна. Усё каштуе пэўных грошай. Таму ствараюцца ўмовы, і меры падтрымкі будуць і далей прадугледжвацца», — сказала яна.

Паводле слоў міністра, у Беларусі будзе распрацоўвацца новая праграма дэмаграфічнай бяспекі на наступную пяцігодку. «Але самае галоўнае: сем'і павінны быць моцнымі, дзеці павінны быць жаданымі, і дзяцей трэба любіць», — сказала Марыяна Шчоткіна.

Прамая лінія

### ХВАРОБА — НЕ ПРЫСУД

Самыя розныя пытанні, звязаныя з прафілактыкай і лячэннем дабраякасных і злаякасных пухлін, а таксама з арганізацыяй анкалагічнай дапамогі, можна будзе задаць падчас «прамой лініі» **галоўнаму ўрачу Мінскага гарадскога клінічнага анкалагічнага дыспансера Уладзіміру Сцяпанавічу КАРАНІКУ**.

«Прамая лінія» адбудзецца ў рэдакцыі газеты «Звязда» **12 снежня, у пятніцу, з 12.00 да 13.00** па нумары **287 18 71**. Папярэднія пытанні можна пакінуць, пазваніўшы на нумар **287 18 29**.

## КАЛІ ЗБЫВАЮЦЦА МАРЫ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір МАКЕЙ, міністр замежных спраў:**

***«Трагічныя падзеі ва Украіне сталі каталізатарам беспрэцэдэнтнага за апошнія дзесяцігоддзі росту напружанасці ў Еўропе, абвастрэння супярэчнасцяў, якія назапашваліся. На іх фоне яшчэ больш відавочнымі сталі сістэмныя праблемы ў сферы бяспекі ў рэгіёне АБСЕ. Многія загаварылі аб вяртанні часоў «халоднай вайны». Сёння мы падышлі да небяспечнай рысы, за якой нас можа чакаць зусім не той свет, пра які марылі тыя, хто стаяў ля вытокаў Хельсінкскага працэсу. Беларусь лічыць неабходным сумесна зрабіць тэрміновыя і рашучыя захады, каб прадухіліць раскручванне спіралі ўзаемных абвінавачванняў, пагроз і санкцый. Трэба адкінуць логіку канфрантацыі, вярнуцца ў рэчышча ўзаемапаважлівага, канструктыўнага дыялогу».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 06.12.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10840,00 | ▲ |
| Еўра | 13410,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 204,00 | ▼ |
| Укр. грыўня | 706,19 | ▼ |

■ Вышэйшая школа

## Патрабуюцца ініцыятыўныя, крэатыўныя, адказныя

### ...але запіс у дыпломе зусім не гарантуе прафесійную кампетэнтнасць спецыяліста

**Як знайсці на рынку працы нішу для ўладальнікаў дыпломаў магістраў? Як ліквідаваць разрыў паміж прапановай адукацыйных паслуг і попытам на іх і не дапусціць падзення якасці вышэйшай адукацыі? Адказы на гэтыя пытанні шукалі ўдзельнікі міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Вышэйшая тэхнічная адукацыя: праблемы і шляхі развіцця», якая прайшла на базе БДУІР і сабрала больш за 400 спецыялістаў з Беларусі, Украіны, Расіі, Славакіі, Туркменістана і ЗША.**

### ШТО ЗА КІДКАЙ НАЗВАЙ?

На сёння наменклатура спецыяльнасцяў I ступені вышэйшай адукацыі ўключае ў нашай краіне 384 найменні, а колькасць спецыялізацый і ўвогуле даходзіць да 717.

— Пералік спецыяльнасцяў пастаянна расце пры штогадовым змяншэнні колькасці абітурыентаў. Але ці расце пры гэтым разнастайнасць відаў эканамічнай дзейнасці? Такія даследаванні ў нас не выконваліся, хоць яны вельмі неабходныя, — дзеліцца сваім меркаваннем **начальнік Цэнтра бесперапыннай прафесійнай адукацыі Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы, кандыдат педагагічных навук, дацэнт Вольга ОЛЕКС.** — З 2002 года, калі быў уведзены агульнадзяржаўны класіфікатар Рэспублікі Беларусь «Спецыяльнасці і кваліфікацыі», колькасць спецыяльнасцяў у сістэме аднаступенчатай вышэйшай адукацыі ўзрастала нязначна (ад 0,5 да 3% у год) і, што галоўнае, заканамерна — па меры росту патрэб эканомікі краіны і магчымасцяў ВНУ. Напрыклад, падрыхтоўку ваенных спецыялістаў па шэрагу традыцыйных для расійскіх вышэйшых навучальных устаноў спецыяльнасцяў распачала Ваенная акадэмія Рэспублікі Беларусь.

СТАР. 4

■ Прагноз

## МІНУС 40 СЁЛЕТА НЕ ПЛАНУЕЦЦА

### А НА НОВЫ ГОД — УВОГУЛЕ КАЛЯ 0

**Айчынныя спецыялісты прагназуюць, што гэтая зіма будзе халаднейшай за папярэднюю, якая была анамальна цёплай, паведаміў начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Дзмітрый РАБАЎ.**

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў беларускіх сіноптыкаў, тэмпература паветра ў снежні будзе адпавядаць кліматычнай норме, характэрнай для першага месяца зімы (мінус 5–7 градусаў). Разам з тым для снежня, які лічыцца пераходным перыядам, будзе характэрны няўстойлівы характар надвор'я. Калі на працягу мінулага тыдня тэрыторыя Беларусі была пад уплывам халодных антыцыклонаў, якія абумовілі марознае надвор'е, то ўжо на выхадныя і далей чакаецца пацяпленне і стане больш вільготна, удакладніў гэты прагноз наш эксперт.

СТАР. 3

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Арменія зрабіла яшчэ крок да ЕАЭС



Парламент Арменіі ратыфікаваў дамову аб далучэнні рэспублікі да Еўразійскага эканамічнага саюза (ЕАЭС). За адпаведнае рашэнне прагаласавалі 103 дэпутаты, супраць — 7. Яшчэ адзін парламентарый устрымаўся. Ратыфікацыю падтрымалі ўсе сілы, прадстаўленыя ў заканадаўчым органе краіны, акрамя апазіцыйнай фракцыі «Спадчына». Дакумент аб далучэнні Арменіі да ЕАЭС быў падпісаны ў Мінску 10 кастрычніка.

### Чарговыя перагаворы па спыненні агню на ўсходзе Украіны

На 9 снежня запланавана сустрэча прадстаўнікоў Аб'яднанага цэнтра па спыненні агню на ўсходзе Украіны. Пра гэта паведаміў на брыфінгу прадстаўнік Савета нацыянальнай бяспекі і абароны Украіны (СНБА) Андрэй Лысенка. «Гэта будзе «лакмусавы дзень», каб зразумець, хто і наколькі гатовы выконваць мінскія дамоўленасці», — сказаў ён. Раней Парашэнка абвясціў аб увядзенні ўкраінскімі сілавікамі «Дня цішыні» (рэжым поўнага спынення агню) на паўднёвым усходзе краіны, які павінен пачацца 9 снежня. Па словах Лысенкі, «Украіна гатовая забяспечыць «Дзень цішыні» і выконваць мінскія дамоўленасці». «Як толькі цэлы дзень будзе падтрыманне цішыні, гэта будзе старт для выканання мінскіх дамоўленасцяў: пачатку адводу цяжкага ўзбраення на 15 км і далей, вызвалення заложнікаў, зняцця мінных загарод, наступнага вываду ўзбраенняў і дэмілітарызацыі рэгіёна», — сказаў спікер СНБА.



ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### Расія падпісала са Славакіяй «нафтавы» дагавор

Міністр энергетыкі Расіі Аляксандр Новак і міністр прамысловасці Славакіі Павал Паўліс падпісалі доўгатэрміновы дагавор аб пастаўках расійскай нафты ў Славакію і яе транзіце ў еўрапейскія краіны, паведамляюць інфармагенцтвы.



Дагавор заключаны тэрмінам на 15 гадоў — са студзеня 2015 года да канца 2029 з наступнай аўтаматычнай пралангацыяй на кожныя пяць гадоў, калі не будзе пярэчанняў бакоў. Дакумент прадугледжвае штогадовыя пастаўкі з Расіі ў Славакію да 6 млн т нафты па трубаправодзе «Дружба», такі ж аб'ём сыравіны пойдзе транзітам праз славацкую тэрыторыю ў трэція краіны.

Тэрмін папярэдняга дагавора, заключанага яшчэ ў 1991 годзе, заканчваецца 31 снежня.

КОРАТКА

**Указамі Прэзідэнта Беларусі першай і другой заставам 15-й групы органаў пагранслужбы прысвоены імёны «Астравецкая» і «Маладзечанская».**

У Мінску з 12 снежня 2014 года па 15 студзеня 2015 года разгорнецца «Калядны кірмаш». Кірмашовыя рады будуць працаваць на Кастрычніцкай плошчы і каля Палаца спорту штодзённа з 12.00 да 21.00. Дарэчы, кірмаш каля Палаца спорту не спыніць сваю работу і ў навагоднюю ноч. Набыць тавар тут можна будзе з 21.00 31 снежня да 4.00 1 студзеня.

**Беларусь увяла часовую забарону на вываз са сваёй тэрыторыі рэгенерыруемых паперы або кардону (макулатуры і адходаў). Забарона прадоўжыцца да 1 чэрвеня 2015 года.**

Самымі шчодрымі ў Беларусі з'яўляюцца турысты з Расіі, Вялікабрытаніі, Германіі, Турцыі.

**Па цудоўнай традыцыі, закладзенай у 2010 годзе, у ноч з 13 на 14 студзеня галоўны тэатр краіны — Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Беларусі — запрашае сустрэць стары Новы год у сваіх сценах. Імпрэза пачнецца 13 студзеня ў 20.30 і завершыцца 14 студзеня ў 3.00.**

Кіраўнік МЗС Украіны Павел Клімкін пацвердзіў, што падрыхтоўка да новай сустрэчы ў мінскім фармаце прадаўжаецца. Міністр не выключыў, што такая сустрэча можа адбыцца «ў самы бліжэйшы час».

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

## «БО ЯНА НАСАМРЭЧ РОДНАЯ!»

**Алена ПАНЦЮХОВА, дырэктар Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства радыётэлецэнтр «Тэлерадыёкампанія «Віцебск»:**



— Шчыра прызнаюся, калі ўзначаліла калектыў «Тэлерадыёкампаніі «Віцебск», часу, каб пачытаць газеты, бывае вельмі мала. Але стараюся з самай раніцы прагартаць свежыя нумары рэспубліканскіх, абласнога і гарадскога выданняў. Было вельмі прыемна, што мая любімая газета «Звязда» паведаміла пра тое, што ў нашай краіне запрацаваў у эфіры першы абласны тэлеканал «Віцебск». Гэта стала магчымым дзякуючы падтрымцы старшыні Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта Аляксандра Мікалаевіча Косінца. У эфіры мы штодня вяшчаем больш за 17 гадзін. Выпускі навін, якія, дарэчы, выходзяць кожную гадзіну, робім на беларускай мове. Спрабуем працаваць на роднай мове і ў прамым эфіры. Думаю, гэта вельмі важна.

«Звязда» для мяне насамрэч «родная газета на роднай мове». Я — беларуска, ганаруся тым, што вучылася на факультэце беларускай філалогіі і гісторыі Віцебскага педагагічнага інстытута імя П. М. Машэрава. Чытала «Звязду», калі яшчэ была студэнткай. У газеце мне падабаліся артыкулы, прысвечаныя гісторыі Беларусі, а таксама краязнаўчыя, разважанні наконт таго, што нельга здраджваць роднай мове. Гэта насамрэч так і ёсць.

З задавальненнем іграла ў студэнцкім тэатры. Дарэчы, рэжысёр Уладзімір Сівіцкі, які працаваў на абласной студыі тэлебачання, разам з іншымі студэнтамі, запрасіў мяне на кастынг, які я паспяхова прайшла... Працавала карэспандэнтам у аддзеле навін, потым узначаліла карэспандэнцкі пункт па Віцебскай вобласці Агенцтва тэлевізійных навін Белтэлерадыёкампаніі. Канешне, каб быць у курсе падзей, абавязкова чытала газеты. І «Звязда» перыядычна прыемна здзіўляла мяне цікавымі публікацыямі. Некаторыя дапамагалі рабіць сюжэты.

Лічу, што ў час актыўнага карыстання інтэрнэтам газетам не трэба «гнацца за навінамі», тым больш што і па тэлебачанні іх агучыць хутчэй. «Звязда» робіць стаўку на цікавыя артыкулы. Вельмі добра чытаюцца рэпартажы з рэгіёнаў, інтэрв'ю з цікавымі людзьмі, якія жывуць у глыбінцы. У «Звяздзе» мне падабаюцца ўкладкі: «Сямейная газета», «Ігуменскі тракт», «Усё пра Еву».

**Запісаў Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА. Да чытача з любоўю!

ШАНОЎНЫЯ СЯБРЫ!

Працягваецца падпіска на «Звязду» на I паўгоддзе 2015 года!

**Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.**

**Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам да свята для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.**

УВАГА! Толькі з 1 па 15 снежня пры падпісцы ў аддзяленнях РУП "Белпошта" ці ў паштальёнаў цана на месяц для індывідуальных падпісчыкаў — 56 150 беларускіх рублёў.

| Індэкс/перыяд | 1 месяц | 3 месяцы | 6 месяцаў |
|---|---|---|---|
| 63850 (для індывідуальных падпісчыкаў) | 60 000 | 180 000 | 360 000 |
| 63145 (для ветэранаў ВАВ і пенсіянераў) | 54 000 | 162 000 | 324 000 |
| 63858 (для ведамасных падпісчыкаў) | 140 000 | 420 000 | 840 000 |
| 63239 (ведамасная падпіска для ўстаноў міністэрстваў адукацыі, культуры і аховы здароўя) | 126 500 | 378 000 | 756 000 |